анонсы

# Мемуары народнага

**У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыў свет першы том кнігі Мікалая Чаргінца «Цяжкія дарогі жыцця». Выданне ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

Народны пісьменнік Беларусі Мікалай Чаргінец расказвае пра свой лёс, з чаго пачыналася самастойнае жыццё. Згадвае сваю сям'ю, тое, якія выпрабаванні яго родныя і блізкія прайшлі ў перыяд фашысцкай акупацыі Мінска. Шмат падрабязнасцей у першым томе — пра футбольныя, спартыўныя зацікаўленні маладога чалавека. Мікалая Чаргінца ведалі тысячы аматараў футбола, прычына — высокае майстэрства спартсмена. Старонкі пра спартыўнае жыццё, як мне падаецца, асабліва цікавымі будуць маладым людзям, якія праз спорт загартоўваюць свой характар. Піша аўтар падрабязна, вымалёўваючы многія дэталі, паказваючы псіхалогію моладзі часін яго юнацтва.

Другім важным складнікам станаўлення характару, а таксама і будучых творчых здольнасцей Мікалая Чаргінца стала служба ў праваахоўных органах. Пра гэта — многія старонкі кнігі «Цяжкія дарогі жыцця».

Мікалай Чаргінец — твар нашай краіны, чалавек, які аб'ехаў дзясяткі краін, літаратар, чые кнігі перакладзены на многія мовы народаў свету: азербайджанскую, англійскую, турэцкую, персідскую, таджыкскую і іншыя. Агульны тыраж раманаў Мікалая Чаргінца, выдадзеных у розных кутках свету, — болей як 7 мільёнаў экзэмпляраў. За свае творчыя і грамадскія дасягненні народны пісьменнік адзначаны шматлікімі міжнароднымі прэміямі, дзяржаўнымі ўзнагародамі СССР, Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў. Асоба гэтага вядомага аўтара і палітыка — яскравы прыклад служэння грамадству і Айчыне.

Днямі народны пісьменнік Беларусі, ганаровы старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі адзначыў свой 85-гадовы юбілей. Сёння ў 17.00 ў Нацыянальнай бібліятэцы адбудзецца ўрачысты творчы вечар юбіляра. Набыць кнігі юбіляра і атрымаць аўтограф можна ў фае бібліятэкі пачынаючы з 15 гадзін.

**Мікола БЕРЛЕЖ**